# РЕЦЕНЗИЯ

**Гісторыя Беларусі для спецыяльнасці 1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны: вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне:** у 2 ч. / склад. І.У. Мандрык. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2019. – Ч. 2. – 199 с. – Тыраж 182 экз.

Сённяшні этап у развіцці нашага грамадства ставіць перад гістарычнай навукай найгалоўнейшую задачу – даць аб'ектыўную ацэнку найбольш важным фактам, падзеям і працэсам мінулага краіны, азнаямленне з якімі дапаможа фарміраванню ў моладзі нацыянальнай свядомасці і далучэнню яе да актыўнага ўдзелу ў будаўніцтве суверэннай, моцнай і квітнеючай Рэспублікі Беларусь.

Менавіта гэта імкнуўся вырашыць прафесар, доктар гістарычных навук І.У. Мандрык у вучэбна-метадычным комплексе па гісторыі Беларусі (перыяд мадэрнізацыі савецкай мадэлі).

З аналізу зместу ВМК можна ўбачыць, што пры распрацоўцы дадзенай працы аўтар прымяняў сучасныя навуковыя падыходы.

Выданне пабудавана на базе тэарэтычных распрацовак, якія назапашаны за апошнія гады навукоўцаўмі рэспублікі, а таксама на аснове дакументаў Нацыянальнага архіва рэспублікі, абласных дзяржаўных архіваў (гэта тычыцца больш за ўсё Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці).

Вельмі важна, што асноўнай устаноўкай, у адпаведнасці з якой ствараўся ВМК, былі прынцыпы кананічнасці і патрыятычнасці, без чаго нельга ўявіць айчынную гісторыю.

Дакументальная база, якой карыстаўся аўтар, надала яму магчымасць з высокай дакладнасцю высветліць прычынна-выніковыя сувязі і паказаць заканамернасці гістарычнага развіцця беларускага народа ў савецкі перыяд.

Аўтар працы згодна з агульнапрынятай канцэпцыяй праз усе раздзелы вучэбнага комплексу даводзіць да яго карыстальнікаў, што афіцыйны курс, які існаваў і праводзіўся кіраўніцтвам БССР, безумоўна, не быў адзіна магчымым. Гістарычны працэс у рэспубліцы насіў нераўнамерны, хвалепадобны і спіралепадобны характар. У беларускім грамадстве мелі месца і трагізм, і застой, і абмежаванасць нацыянальна-культурнага жыцця, іншыя хібы. Але разам з тым развіццё Беларусі ў савецкі час вызначаецца прагрэсам у развіцці матэрыяльнай вытворчасці і высокімі духоўнымі дасягненнямі беларускага народа.

Уключэнне ў выданне матэрыялаў, якія раней не былі ўведзены ў навуковы зварот, дазволіла аўтару раскрыць многія старонкі мінулага ў новым асвятленні, давесці да аматараў гісторыі Айчыны слушную думку, што нават у самыя змрочныя часы палітычнага рэжыму грамадская атмасфера ў краіне была прасякнута пафасам стваральнай працы. У вытворчай дзейнасці беларускага народа мелі месца сапраўдны працоўны гераізм і добрасумленнае служэнне Айчыне. У працоўнае асяроддзе ўкараняліся каштоўнасці чалавечай дабрыні, салідарнасці і справядлівасці. Намаганнямі працоўных у краіне сфарміравалася развітая структура эканомікі і высокая навукаёмістая прамысловая вытворчасць.

Асабліва хуткія тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця рэспубліка мела ў перадваенны і пасляваенны час. Працоўныя БССР разам з народамі нацыянальных рэспублік Сярэдняй Азіі, Каўказа, Прыбалтыкі, іншых рэгіёнаў паспяхова вырашалі задачы па фарміраванні цэласнага высокатэхналагічнага народнагаспадарчага комплексу СССР.

Значную цікавасць ВМК набывае яшчэ і таму, што асэнсаванне гістарычнага працэсу ў БССР зроблена з акцэнтаваным паказам падзей, што адбываліся на рэгіянальным узроўні – у Прыдзвінскім краі.

Прадуктыўны падыход аўтар выбраў пры асвятленні сучаснага гістарычнага перыяду

ў развіцці краіны. Ён паказвае, што развіццё Рэспублікі Беларусь пасля набыцця ёю суверэнітэту адбываецца ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай цывілізацый.

Хаця фарміраванне сацыяльна арыентаванай дзяржавы, здольнай рэальна забяспечыць годны ўзровень жыцця кожнаму чалавеку, з'яўляецца задачай дастаткова складанай, усе ж яе можна выканаць. Для гэтага ў краіне ёсць добрыя магчымасці: створаныя папярэднікамі матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці, прыхільныя адносіны да лёсу Айчыны мільёнаў беларусаў, шматвектарная знешняя палітыка дзяржавы.

На наш погляд, дадзенае навукова-практычнае выданне вызначаецца высокай ступенню аб'ектыўнасці, дакладнасці і гістарычнай праўдзівасці пры асвятленні ўсіх пададзеных падзей.

Закрытых тэм і нязручных пытанняў для аўтара не існуе. З чытачом увесь час ідзе шчырая размова.

Звяртаюць на сябе ўвагу лаканічная мова тэксту, яго лінгвістычная эканомія і семантычная празрыстасць усіх выказванняў.

Дадзенае выданне дазволіць павысіць якасць навучальнага працэсу ў ВНУ і можа стаць каштоўнай крыніцай для выкладчыкаў грамадскіх дысцыплін, аспірантаў, шырокага кола чытачоў.

**М.А. Слямнёў**